Гарадская грамадска-палітычная газета

Бабруйскае жыццё

Выдаецца з лістапада 1918 года



№126-127 (15830-15831) ПЯТНІЦА, 18 жніўня 2000 года. Цана 50 руб.

БЛАГОДАРНОСТЬ ГЛАВЫ ГОСУДАРСТВА

За умелые, инициативные и смелые действия по спасению людей, активное участие в профилактической работе по предотвращению несчастных случаев на воде Президент Республики Беларусь своим распоряжением объявил благодарность **Валерию Иосифовичу ВЕРЖБИЦКОМУ** – руководителю спасательной станции № 2 г. Бобруйска.

ШКОЛЬНЫ КІРМАШ

У нашым горадзе ўжо стала традыцыяй праводзіць школьны базар. Падрыхтоўка да навучальнага года прыносіць шмат праблем бацькам, дзеці якіх 1 верасня сядуць за парты. Яны (бацькі) апошнія летнія дні "накручваюць" шмат кіламетраў у пошуках школьнага інвентару. А палегчыць гэты стан сумятні дапамогуць школьныя кірмашы, якія адбудуцца 19 жніўня на плошчы імя Леніна і 26 жніўня каля Палаца культуры "Шыннік". Тут вы зможаце набыць усё неабходнае для таго, каб ваш вучань смела ўступіў на парог ведаў.

Наш кар.

САЮЗ АФІЦЭРАЎ МЯНЯЕ КІРАЎНІЦТВА

Адбылося чарговае пасяджэнне савета бабруйскай арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў. На ім разгледжваліся пытанні падрыхтоўкі да выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і аб стварэнні ў горадзе пярвічных арганізацый саюза афіцэраў, росту яго радоў.

На пасяджэнні разгледжана арганізацыйнае пытанне. Старшынёй савета бабруйскай арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў замест памёршага Л. І. Раеўскага выбраны падпалкоўнік у адстаўцы Я. С. Вярэніч. яго намеснікам стаў палкоўнік у адстаўцы А. І. Гляшчаў.

А. БАБКОЎ,
член савета гарадской арганізацыі саюза афіцэраў.



Валянціна Фаменка – загадчыца лячэбна-прафілактычнага аддзялення дзіцячай стаматалагічнай паліклінікі № 1.

Пасля заканчэння Бабруйскага медыцынскага вучылішча, па накірунку чатыры гады адпрацавала ў хірургічным аддзяленні бальніцы "Лаўсан" г. Магілёва. У 1989 годзе паступіла ў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут пасля заканчэння якога вярнулася ў родны горад.

Працавала ў тэрапеўтычным аддзяленні паліклінікі, стацыянарных школьных і дзетсадаўскіх стаматалагічных кабінетах. Набіралася вопыту, прыходзіла майстэрства, таму і займае зараз гэтую пасаду.

У гэтым годзе рэспубліканская камісія вызначыла высокія паказчыкі прафілактычнай работы стаматалагічных захворванняў сярод школьнікаў горада Бабруйска. У чым немалая заслуга і Валянціны Фаменка (на здымку).

Аляксандр ФІСЕНКА.

20 жніўня – Дзень ваенна-паветраных сіл

В ГОРАХ ТАДЖИКИСТАНА

В горах Таджикистана есть перевал Плавельского, названый в честь нашего земляка, летчика Михаила Андреевича Плавельского.

Он родился 13 марта 1908 года в городе Бобруйске, работал десятником на заводе, а в 1927 году поступил в 1-ю Военную школу летчиков им. Мясникова (в настоящее время это Качинское высшее училище).

В 1929 году М. А. Плавельский успешно закончил школу летчиков и был направлен в Туркестанский военный округ в авиаотряд им. Я. М. Свердлова. Принимал участие в боевых полетах по разведке банд басмачей и выполнял другие задачи. Был отличным летчиком. В 1930 году на собранные денежные средства местного населения был построен самолет "Горный Таджикистан", и на базовом аэродроме делегация трудящихся этот самолет передала лучшему летчику – Плавельскому. Он заверил командование отряда им. Я. М. Свердлова и делегатов трудящихся, что оправдает высокое доверие.

Так какой же подвиг совершил наш земляк, что в честь его назван перевал?

В 1931 году полуторатысячная банда басмачей Ибрагим-Бека ворвалась в пограничные районы Таджикистана, басмачи вырезали ночью население одного из горных кишлаков и штаб округа принял срочные меры по ликвидации группировки басмачей.

Командир отряда поставил боевую задачу летчику Плавельскому и штурману Куклину разведать размещение басмачей и сообщить об этом оперативной группе кавалерийского отряда и пулеметным заслонам.

В одном из ущелий летчик обнаружил большую группу кавалеристов, приняв их за своих, снизил высоту, однако, это были басмачи, они спешились и открыли огонь по самолету. Машина была повреждена и потребовалось мастерство, чтобы посадить ее на небольшой площадке у края пропасти в горах.

Дорога была каждая минута, командир приказал штурману Сергею Куклину срочно с донесением бежать в размещение нашего кавалерийского отряда и пограничников, а сам снял пулемет, установил его между двумя огромными валунами, занял оборону.

Вскоре появились конники в полосатых халатах и лохматых шапках. Михаил тщательно прицеливался и посылал в басмачей очередь за очередью из пулемета. Лошади вставали на "дыбы", сбрасывая своих седоков.

Бой продолжался несколько часов, на исходе были боеприпасы. Бандиты поняли, что не смогут взять в плен отважного летчика и пошли на хитрость.

Бросились врассыпную, а на горной тропе с поднятыми над головой шашками появились всадники в красноармейкой форме.

Приняв врагов за своих, М. А. Плавельский вышел из укрытия и силой был пленен.

Басмачи пытались склонить комсомольца на свою сторону. Однако ни богатые обещания, ни зверские пытки не могли сломить стойкость, мужество, верность присяге Матери-Родине!

Враги удивлялись мужеству советского летчика, после издевательств его зверски убили.

Штурман Куклин успел передать разведданные командиру конного отряда, банда была разгромлена наземными войсками и друзьями – летчиками отряда Я. М. Свердлова. Эти бои длились три месяца, банды ближайших помощников Ибрагим-Бека были разбиты, а их командиры оказались в плену.

Когда отгремели последние бои, местные жители и боевые товарищи вошли с ходатайством в правительство Таджикистана об увековечении памяти летчика. Начался сбор средств на строительство нового самолета и памятника герою-летчику.

В июне 1931 года новый самолет был передан авиаотряду им. Я. М. Свердлова , а на горном перевале поставлен обелиск в честь подвига нашего земляка.

Возможно в нашем городе еще живут потомки отважного летчика-комсомольца но для авиаторов туркестанцев это имя стало символом стойкости, мужества и беззаветной преданности Родине.

В. ГОЛАЕНКО,
председатель совета ветеранов Ленинского района г. Бобруйска.

У СУБОТУ, НА АВІЯЦЫЙНА-СПАРТЫЎНАЕ СВЯТА

У гонар Дня ваенна-паветраных сіл Рэспублікі Беларусь заўтра ў нашым горадзе адбудзецца авіяцыйна-спартыўнае свята. Распачнецца яно на аэрадроме авіягарадка ў 10 гадзін раніцы.

У праграме – дэманстрацыйныя палёты баявой авіяцыйнай тэхнікі, выступленні планерыстаў і парашутыстаў аэраклуба, воінаў Бабруйскага гарнізона, канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці. Як заўжды будуць разгорнуты гандлёвыя рады.

Экология

Грибы: внимание — радиация

Этот год порадовал нас не только урожаем ароматных фруктов, но и обилием разнообразных грибов. Однако не всегда безопасно это лесное лакомство для нашего здоровья, как утверждает инспектор Штаба гражданской обороны Г. В. Красулин:

– В результате радиометрических исследований, проводимых в лаборатории ветсанэкспертизы Бобруйского рынка, были выявлены наиболее опасные в данном отношении лесные массивы. В Светлогорском районе – это места недалеко от деревень Гаричи, Михайловка, в Жлобинском – Степы, в Кировском – Скачек, в Бобруйском – Дубовка, Станы, Поречье, Ломы, Глуша. При норме на свежие грибы, равной 370 Бк/кг, собранные там "дары леса" зачастую превышают норму в 2-3 раза.

По словам лаборанта ветсанэкспертизы Вероники Чудаевой, чаще всего повышенное число радионуклидов обнаруживается в болотянках, моховиках, польских. Относительно чистые грибы – боровики, лисички, подберезовики. Помните об этом, самостоятельно отправляясь в лес.

Марина САКАДЫНЕЦ.

ЧУТЬ НЕ СГОРЕЛИ ЗАЖИВО

Еще один несчастный случай в результате несоблюдения правил трудовой дисциплины произошел 2 августа 2000 года. Транспортная автоколонна филиала № 4 по механизации и автотранспорту ОАО "Белтрубопроводстроя" остановилась на ночлег, не доехав 5 км до д. Глуша на трассе Слуцк – Бобруйск. Автоколонна состояла из автомобиля КРаЗ, перевозящего со строительной площадки кран, и сопровождающего его автомобиля ГАЗ-52 с фургоном, где находились работники этого же филиала. В фургоне была металлическая печь, которую разожгли на стоянке. Одновременно почувствовав запах бензина в фургоне, люди стали искать его источник. Работник С. обнаружил стоящую за печкой полиэтиленовую канистру с бензином и хотел ее выбросить из фургона. Когда он ее поднял произошел разрыв канистры. Работников филиала С. и находящегося рядом Н. облило бензином, произошло возгорание одежды, возник пожар. В результате С. и Н. получили ожоги тяжелой степени, и сейчас врачи ведут борьбу за их жизнь в реанимационном отделении больницы.

Причиной несчастного случая явилось нарушение норм и стандартов по вопросам охраны труда и противопожарной безопасности как руководителями филиала, так и его работниками. Комиссией проводится расследование.

Н. НИЧКАСОВА,
ведущий госинспектор Бобруйской межрайонной инспекции труда.

ГАИ информирует

С места происшествия скрылся

16 августа в 18.00 неустановленный автомобиль (ориентировочно "Жигули" зеленого цвета без регистрационных знаков), двигаясь по ул. Ульяновской со стороны ул. 50 лет ВЛКСМ в районе д. 49, совершил наезд на пешехода, которая переходила проезжую часть по пешеходному переходу. Водитель с места происшествия скрылся, не оказав первую помощь пострадавшей, которая с переломами и черепно-мозговой травмой была госпитализирована в МСЧ БШК.

Госавтоинспекция обращается с просьбой к гражданам, которые являлись очевидцами данного происшествия, позвонить по телефонам: 0-54, 2-53-44, 02 (анонимность гарантируется).

Почем валюта?

Вчера курс **доллара США** в банках города составил: *покупка – 986-990 руб., продажа 996 руб.*; **немецкая марка** – *440-459 (покупка) и 460-464 (продажа)*; **российский рубль** – *32-35 руб. и 36 руб.*

Официальный курс Нацбанка:
доллар США – *845*, **немецкая марка** – *392,49*, **российский рубль** – *30,47*.

На ***"черном"*** рынке **"зеленый"** наконец перешагнул тысячную отметку. Его покупают за *1000 руб.*, а продают по *1020-1040 руб.* **Немецкая марка** "оценена" в *470-470 руб.*, **российский рубль** – *36-37 руб.*

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА "БЖ"

СТВАРАЮЦЬ ЛЮДЗЯМ ДОБРЫ НАСТРОЙ

Зрабіў я ў кватэры рамонт і думаў, што навёў парадак і буду жыць спакойна. Але вось у туалеце прарвала трубу, і кватэру стала заліваць вадой. Справа складаная: трэба матэрыялы ды адмысловы інструмент. А гэтага няма.

Вырашыў звярнуцца па дапамогу ў жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак № 8, які абслугоўвае наш дом. Маю заяўку там прынялі без усялякіх сумненняў. Да таго ж паабяцалі, што сантэхнік прыдзе ў самы бліжэйшы час, а таму трэба, каб нехта быў дома. Мне спачатку нават не паверылася, што так хутка можна вырашыць маю складаную справу.

На мой выклік прыйшоў брыгадзір сантэхнікаў Аляксандр Тараховіч. Ён уважліва ўсё агледзеў і сказаў, што хвалявацца няма чаго. А праз нейкія паўгадзіны брыгадзір прыйшоў з сантэхнікам Пятром Богданам, і абодва з рупнасцю ўзяліся за рамонт. Нямала давялося ім папрацаваць, каб аднавіць тое, што лічылася амаль што непрыдатным. І гадзіны праз тры ў маёй хаце быў поўны парадак: нічога нідзе не ліпося, не працякала, а з кранаў ішла вада. Я хацеў нейк аддзячыць сантэхнікаў, але хлопцы замахалі рукамі, сказаўшы на хаду: "Гэта наша праца. За яе мы грошы атрымліваем...".

Зайшоў у жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак № 8 і пацікавіўся аб'ёмам работы сантэхнікаў, яе складанасцю і г.д. Даведваюся, што брыгада сантэхнікаў абслугоўвае каля трох тысяч кватэр. Як бачна, аб'ёмы абслугоўвання вялікія. А калі ўлічыць, што багата якія каналізацыйныя і водаправодныя сістэмы зношаныя і патрабуюць капітальнага рамонту, то работы прыбаўляецца ўдвая.

Паразмаўляў з майстрам участка Валянцінам Касцевічам, які расказаў мне пра паўсядзённыя справы і планы, назваў лепшых сваіх працаўнікоў. У іх ліку брыгадзір сантэхнікаў А. Тараховіч, сантэхнікі П. Богдан, А. Стукала, М. Рамаi оўскі, зваршчык Ю. Палілей. Менавіта ім у першую чаргу ўдзячныя насельнікі дамоў, якія абслугоўваюць гэтыя руплівыя і майстравыя працаўнікі.

Хапае ў сантэхнікаў і праблем. У прыватнасці, адносна запчастак і матэрыялаў, якія даводзіцца здабываць з вялікімі цяжкасцямі. Вось так у клопатах, у непарыўнай сувязі з насельнікамі абслугоўваемых дамоў і працуюць майстры-сантэхнікі.

Васіль КАСЦЯН,
інжынер-энергетык.

ТАКІЯ ПРАЦАВІТЫЯ ДВОРНІКІ...

Вы ніколі не зважалі на тое, як працуюць дворнікі? А шкада. Усё ж такі прыглядзецца і ацаніце як мае быць іх працу. Раніцой і ўдзень яны прыбіраюць, а ўвечары, бывае, і следу не заўважыш ад іх рупнасці: насмечана, накідана, насыпана і г.д. Я лічу, што двор – гэта працяг нашай кватэры. І каб былі чысціня і парадак, у кватэры прыбіраюць нават некалькі чалавек, а ў двары ўсё робіць адзін.

Я часта назіраю, як спрытна працуе дворнік Наталля Фаміч. Прыемна глядзець як увішна яна прыбірае, як дбае пра чысціню на сваім участку. Праца ранейшых дворнікаў ніякіх думак і эмоцый у мяне не выклікала. А як стала працаваць Наталля Васільеўна, то, як кажуць, сэрцу люба становіцца.

Паболей трэба пісаць пра такіх руплівых і шчырых працаўніц. Няхай ведаюць пра іх людзі.

А яшчэ я хачу звярнуцца да кіраўніцтва гарадскога дарожнага эксплуатацыйнага прадпрыемства, дзе працуе Наталля Фаміч. Было б вельмі добра, каб працу гэтай рупнай жанчыны заахвоцілі як маральна, так і матэрыяльна. І болей таго: няхай пра гэта людзі даведаюцца праз газету.

А. РАДЗІНСКАЯ,
бабруйчанка.

* * *

"Любую працу трэба шанаваць", – так выказваюцца разумныя і добрыя людзі. А калі гэтую працу выконвае старанны і сумленны чалавек, то ён заўсёды даб'ецца плёну і пашаны.

Здавалася б, у дворніка праца непрыкметная: памахаў венікам ці рыдлёўкай, прыбраў усё ды з двара зышоў. А я думаю інакш: гледзячы хто выконвае гэтую працу, як да яе ставіцца: Я ўсё болей і болей прыглядваюся да працы дворнікаў і раблю высноў: гэта дзякуючы іх рупнасці і добрасумленнаму выкананню сваіх абавязкаў горад наш становіцца чыстым і больш утульным. Гэтую акалічнасць ужо не адзін раз адзначалі прыезджыя.

Я хачу сказаць некалькі добрых слоў пра Ніну Харытонаву, якая працуе дворнікам у жыллёва-эксплуатацыйным участку № 13. Ніна Васільеўна, у прыватнасці, прыбірае ўчастак нашага дзевяціпавярховага дома, які месціцца на вуліцы Урыцкага, 137. Да яе тэрыторыя двара была засмечаная, бо прыбіралася абы з рук. Пасля таго як гэтая працавітая жанчына стала прыбіраць наш двор, то ён адразу нібы папрыгажэў: усюды чысціня, нідзе ані смецця, ані паперы.

Добрасумленна выконвае Харытонава свае абавязкі. Пажадаем жа ёй моцнага здароўя, поспехаў і прыбаўкі да заробку.

А. ГУБЕРСКАЯ,
ветэран педагагічнай працы.

МУЗЫКА ГРАЕ, СПАЦЬ НЕ ДАЕ...

Мы, насельнікі дома № 66, што на вуліцы Ульянаўскай, вырашылі звярнуцца ў газету "Бабруйскае жыццё" вось з якой нагоды. Пад нашымі кватэрамі месціцца кафэ-бар "Марка". Ну і хай сабе людзі гуляюць і адпачываюць! Так, гулялі там раней кліенты і гулялі ціха. А потым пачала граць музыка і весяліць публіку. Мала таго, што грае да паўночы, дык і пасля гэтага часу не суніімаецца. Нам жа, насельнікам дома, спаць трэба, бо некаторыя працуюць па зменах, рана кладуцца спаць, каб раней устаць.

Бывае, і пасля сканчэння музыкі гульня ў бары не сціхае: чуваць гучныя галасы, выказванні, лаянка і г.д. Няхай яны, гэтыя гулякі ды іх абслугоўвальнікі, прачытаюць гэтыя радкі ды суніімуцца. Няхай ведаюць, што цярпець далей мы не будзем.

ПРАКОПЧЫК, САВЕЛЬЕВА, БАРКОЎСКІ, БАТРАК і іншыя насельнікі дома № 66.

Любоў Крыж лічыць сябе шчаслівай



Калі дзеці жадаюць быць як маці? Бадай калі яна асабістым прыкладам дае магчымасць дзіцяці адчуць значнасць сваёй працы і любоў. Так! Менавіта любоў: да справы, якой займаешся, родных і блізкіх, сяброў. Асаблівa любоў да дзяцей. А калі гэта памножана на чатыры, то зразумела чаму Любоў Іванаўна Крыж лічыць сябе шчаслівай.

На народную вытворча-камерцыйную фірму "Славянка" яна прыйшла ў 1979 годзе, адразу пасля заканчэння Мінскага ПТВ № 93. Шмат часу працавала швачкай, зараз на больш адказнай аперацыі – тэрмаапрацоўцы. Па выніках апошняга конкурсу прафесійнага майстэрства, заняла першае месца .

Па словах начальніка цэха № 3 Марыны Мікалаеўны Гайшун, Любоў Іванаўна карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калектыве, а галоўнае – вельмі патрабавальная да сябе. Можа таму старэйшая дачка Марына і сярэдняя Таццяна вырашылі сваё жыццё звязаць са швейнай вытворчасцю і з задавальненнем вучацца ў прафесійных вучылішчах № № 73 і 145. Ну а малодшыя – дачка і сынуля – яшчэ не ведаюць кім будуць. Але падобнымі на старэйшых абавязкова.

На здымку: Любоў Крыж.

А. ФІСЕНКА.

Приютские дети: свои среди чужих, чужие среди своих

Вместо вступления

О чем мечтают обыкновенные современные дети? О золотоволосых куклах Барби, компьютерных приставках, модной одежде и Макдональдских "Хеппи-Милах". А о чем мечтают дети, попавшие в Бобруйский городской приют для несовершеннолетних? Конечно, о семье. О заботливой доброй маме и сильном, веселом папе – о тех, кто бы их любил, кто болел бы их заботами и радовался их скромным и большим успехам. Мечтают о тех, кто бы их жалел, ведь ласка нужна каждому человеку, а маленькому – в особенности. Приютские человечки всего этого лишены, поэтому отделом образования Бобруйска было принято решение о том, чтобы позволить всем добрым людям, небезразличным к детскому горю, брать на выходные или на целые летние каникулы любого ребенка из приюта к себе домой (эта акция получила название "Доброе сердце"). Таких, к сожалению, нашлось немного – сегодня только восемь ребят временно обрели семью. Благодаря помощи директора приюта А. М. Минецу, мне удалось побывать у некоторых из них. Сопровождала меня в этой маленькой "экскурсии" по чужим судьбам психолог Ольга Викторовна Сморгович.

Глава 1: Барак, где согреваются сердца (совсем не по Б. Шоу)

Первым на нашем "пути" оказался дом на улице Куйбышева, где сегодня живут два брата – Артем Колесников и Витя Тункевич. Правда, домом это сооружение назвать я могу с натяжкой: чёрный деревянный барак, перед которым остановился приютский микроавтобус, поразил меня своим убогим внешним видом. Признаюсь, не думала, что в Бобруйске еще осталось "такое". Мой изумленный немой вопрос, как люди всё-таки умудряются жить здесь без удобств и горячей воды, сменился чувством неловкости за собственную квартиру в новостройке – стало както неудобно, словно я в чемто провинилась.

"А вот и Артем нас встречает", – сказала Ольга Викторовна, заметив у подъезда невысокого русоволосого мальчика девяти лет. Тут же из недр барака вынырнул и синеглазый Витя, как-то загадочно улыбаясь нам (смысл этой улыбки я поняла немного позже). Вчетвером мы вошли в маленькую квартиру, где нас в тесной прихожей уже встречала "бабушка" мальчиков – Людмила Владимировна Лашук. В уютной гостиной, вид которой сразу сгладил тягостное впечатление от неприглядной "внешности" самого дома, она дополнила краткий рассказ психолога о судьбе братьев, выслушанный мною по дороге к ребятам: мать их недавно лишена родительских прав. Где она, сегодня никто не знает.

" Мы соседи, – говорит Людмила Владимировна, – одно время мать мальчиков дружила с моей старшей дочерью. Потом стала пить, часто не ночевала дома. Попала в тюрьму – за что сидела, Бог её знает. Сейчас вот вышла – и опять пропала, а дети остались. Мы их практически с рождения знаем – привязались. Теперь вот двоих берем на каникулы. Своих ни внуков, ни сыновей с мужем у нас нет – две дочери только".

Сегодня Людмила Владимировна хочет оформить на одного из мальчиков опеку, но в гороно не разрешают: "Говорят: нельзя разрывать родственную связь - они же братья, хоть и от разных отцов. Надо брать обоих, а двоих мы не потянем, трудно, – тяжело вздыхает бабушка. – Хоть и младшая дочка нам помогает, и у меня, и у мужа пенсии маленькие... Да и сами немолодые уже – вдруг что случится."

Самой Людмиле Владимировне сейчас шестьдесят, но выглядит она бодрой и очень энергичной – её жизнелюбия, как мне показалось, хватит на четверых.

– Хорошо здесь? – спрашиваю я у мальчиков, которые сидят тут же, рядом с нами в комнате, внимательно прислушиваясь к разговору.

В ответ оба дружно кивают.

– А маму свою помните?

– Нет, – отрицательно качают головами.

– И не любите ее?

– Не-а. Мы бабушку любим.

– А если бы мама вернулась, – подключается к моим расспросам Ольга Викторовна, – если бы она стала хорошей, пошли бы к ней жить?

– Нет! У бабушки лучше...

Слова эти тронули меня своей трагической откровенностью. Конечно, им здесь лучше: и без еды не останешься – бабушка всегда накормит и приласкает с радостью. Вот они и платят ей такой же теплой привязанностью, хотя и доставляют вместе с тем ей кучу хлопот. Но на то они и дети. Правда, не совсем простые – с задержкой в развитии – особенно заметна она у семилетнего Вити (вот и секрет загадочной улыбки). Но во всем своя закономерность – брошенным матерью им не позавидуешь. И страшно становится, что чужой человек этим братьям милее за родного. И радуешься – ведь есть еще люди, способные бескорыстно подарить кому-то свою любовь и согреть замороженные души детей, разочарованных в мире взрослых, своей нежностью... Вите и Артёму повезло – они нашли любовь. И близких.

Глава 2: "Братья (2)" (совсем не по фильму).

У Филиппа и Дениса Луцевичей – двух других братьев, к которым мы заглянули после семьи Лашук есть настоящие родные: живы-здоровы и мать, и отец. Но живут сейчас ребята с бабушкой Ядвигой - папиной мамой. В их двухкомнатной квартире – голые стены и практически нет мебели. Но 15-летний Денис и 12-летний Филипп довольны и этим – все-таки дом. А не школа-интернат, который в их представлении нечто среднее между колонией для несовершеннолетних и матерой зоной.

Отец братьев после автокатастрофы получил инвалидность 3-й группы и сильно запил. Начались постоянные дебоши и побои. Бил он и жену, и детей, часто не пускал мальчиков в школу. Потихоньку стал продавать вещи...

Сейчас лечится от алкоголизма в Могилеве. Родительских прав его, естественно, лишили. А дети попали в приют. Личность их матери для меня осталась не совсем ясна: сыновей через суд у нее отобрали, пока она не обеспечит им нормальные условия для жизни - разменяет квартиру или разведется с мужем. Но пока она с этим не спешит, а ребята с 1-го сентября "рискуют" всё-таки попасть в интернат, которого так боятся. Если бы их мать отказалась от родительских прав, опекуншей Дениса и Филиппа могла б стать бабушка. Но мать от детей отказываться не хочет, постоянно ссорится со свекровью из-за этого... и ничего не делает, чтобы как-то разрешить такую ситуацию. Бабушка мальчиков в панике – отберут внуков! Слушая её сумбурный, эмоциональный рассказ о ребятах, невестке и сыне, мне стало ее искренне жаль. В её-то возрасте заниматься такими проблемами! Обида на своего старшего, сделавшего несчастными и её, и свою собственную семью, перемешалась в ней с любовью ко всё тому же непутевому 35-летнему "ребенку". А тут еще внуков лишают... Но остаться в семье (какой ни есть – но своей) у мальчишек еще шанс есть. Тем более, что интернату, по их словам, они предпочитают самоубийство. Когда мы с Ольгой Викторовной собрались уходить, они отправились на работу к матери – уговорить ее сегодня же пойти в районо.

Глава 3: Незаконченная

Третьим на "очереди" был девятилетний Юра Антоновичус. Однако в гости к семье Оксаны Корзун, взявшей мальчика на лето, мы с Ольгой Викторовной не попали – никого не оказалось дома. По словам соседок, видимо, ушли к бабушке. Ребёнок с трудной судьбой и неровной психикой, по рассказу тех же соседок, просто преобразился в "новой" семье. Словно цветок, пересаженный на хорошую почву. "Такой добрый, умный мальчик... И с Оксаниной дочкой они подружились..." А ведь было как – пришла в приют чужая женщина и попросила разрешить ей взять кого-нибудь из детей на каникулы – просто так... Так иногда происходят маленькие чудеса – Юра страстно мечтал о семье. Сейчас ему хорошо – верю, что его полюбили на новом месте. Есть надежда, что там он и останется. Дай Бог!

Вместо послесловия

Эта поездка оказалась для меня непростой, очень богатой на впечатления и размышления о "чужих" и "своих" – жизнь удивительно построена на контрастах и противоречиях. Но лишний раз убедилась в том, что добрых людей на свете все-таки больше. И значит не все потеряно для этого старого-старого мира.

Марина САКАДЫНЕЦ.

СОРАК ГОД НА ЗАВОДЗЕ

Першы яе жнівеньскі дзень сёлета быў запоўнены кветкамі. З раніцы неслі ёй любімыя пунсовыя гваздзікі. Не забылі жанчыну і кіраўнікі, і рабочыя, і інжынеры завода трактарных дэталяў і агрэгатаў. Яна дзякавала людзям, ад перапоўненых пачуццяў праслязілася.

Якія прыгожыя вочы ў яе? Яна пабачыла многа ў сваім жыцці. Вочы ў яе колеру чыстага вясновага блакіту захавалі агонь чысціні і дабрыні. Ірыне Антонаўне Курыцкай, якая зараз працуе эканамістам па сацыяльных пытаннях, у гэты дзень споўнілася сорак год працы на заводзе. Адлік пачынаецца з таго памятнага дня, калі яна ў далёкім 1960-м годзе пераступіла парог малога ў тыя гады першага і адзінага для яе прадпрыемства. Пасля заканчэння Жыравіцкага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі па нязвыклай для дзяўчыны спецыяльнасці – тэхнік-механік – яна звязала свой лёс з родным калектывам.

Пачынала рабочай. Кім за гэтыя гады толькі не працавала? І загадчыкам склада, і дыспетчарам, і эканамістам, і старшынёй прафкома завода. На апошняй пасадзе знаходзілася ажно дваццаць год. Адначасова і вучылася, скончыла Маскоўскую Усесаюзную вышэйшую школу прафсаюзнага руху.

Размаўляючы з гэтай прыгожай жанчынай, у мяне ўзніклі пытанні. Што запамяталася за гэтыя гады, якія пачуцці адчувае ў святочны дзень? Ірына Антонаўна Курыцкая далікатна адказвала: "Мяркую, што я самая шчаслівая сёння. Для мяне вельмі дарагія мае людзі, іх павага. І гэта не дзяжурныя словы. Згадзіцеся, вельмі прыемна, калі завадчане цікавяцца здароўем, справамі. Лепшага жыцця не жадаю. На маіх вачах рос завод, раслі людзі. Ён павялічыўся па колькасці працуючых амаль у 15 разоў. Памятаю, як узводзіліся новабудоўлі, асабліва паверхі вытворчых карпусоў. Задаволена і асабістым жыццём. Дарэчы, наша з мужам камсамольскае вяселле было першае на заводзе. Як зараз памятаю, вяселле справілі 20 жніўня 1961 года. Муж Аляксандр Альгердавіч і зараз працуе наладчыкам абсталявання на нашым прадпрыемстве. Добрыя і дзеці. Дачакалася чатырох унукаў. Нядрэнна, калі ёсць надзейны тыл у асобе мужа і дзяцей".

Не аб усім мы паспелі парагаварыць. Жыццё Ірыны Антонаўны на заводзе на працягу 40 год не змесціш у кароткім расказе. Ды і сама яна ў размове была сціплай, не хвалілася сваімі ўзнагародамі і дасягненнямі. Больш расказвала аб людзях, з якімі ёй давялося працаваць шмат дзесяцігоддзяў.

В. ГАРБАЧЭНКА.

ТУТ ЁСЦЬ УСЁ, ШТО ПАТРЭБНА ЧЫТАЧАМ

Калі бліжэй знаёмішся з бібліятэкай Дома культуры акцыянернага таварыства "ФанДОК", дарэчы, адной са старэйшых у нашым горадзе, пачынаеш разумець, чаму яна да таго ж яшчэ і лічыцца адной з лепшых па магчымасці абслугоўвання чытачоў.

На самай справе. Калі ў вас няма грошай, каб выпісаць хаця б адну з маскоўскіх газет і вы разлічваеце, што здолееце чытаць яе ў гарадской цэнтралізаванай сістэме бібліятэк, то глыбока памыляецеся, бо, апрача "Комсомольской правды" і "Аргументов и фактов", вы нічога болей там не знойдзеце. Гэтак жа, як і які-небудзь мастацкі часопіс, каб азнаёміцца з лепшымі новымі творамі сучасных расійскіх пісьменнікаў. Нават такі папулярны часопіс, як "Роман-газета", які раней зачытвалі да дзірак, гарадскія бібліятэкі не ў стане выпісваць – на гэта ў бюджэце няма сродкаў.

А вось у бібліятэцы дрэваапрацоўшчыкаў вам прапануюць "Известия", "Труд", "Комсомольскую правду", "Роман-газету", знойдзеце тут такія папулярныя выданні, як "Знание – сила", "Смена", "Наука и жизнь", "Наука и религия", "Эхо планеты", "Мы", "Ровесник", "Искатель", "Мир искателя", "Кинопарк", беларускія "Полымя", "Неман", "Роднае слова", "Народное творчество", "Спадчына" і многае-многае іншые.

Аматары тэхнікі карыстаюцца матэрыяламі, змешчанымі ў часопісах "За рулём", "Юный техник", "Домашний компьютер", "TV парк". А хто з жанчын не ўзрадуецца, ўбачыўшы адрасаваныя ім штомесячнікі "Cosmopoliten", "Домашний очаг", "Бурда", "Лиза", "Ксюша", "Сандра", "Модели сезона", "Итальянская мода". Дзеці маюць магчымасць пачытаць свае любімыя "Мурзилку", "Веселые картинки", "Винни-Пух", "Кипу", "Барби".

Увогуле на бягучы год бібліятэка выпісала 123 перыядычныя выданні, з якіх 74 – расійскія.

Шчыра кажучы, работнікам гарадскіх бібліятэк застаецца толькі зайздросціць сваім калегам з Дома культуры і раіць сваім чытачам звярнуцца туды, каб атрымаць патрэбную ім літаратуру.

Зразумела, наяўнасць разнастайнай перыёдыкі з"яўляецца галоўнай з прычын, якія садзейнічаюць папулярнасці храма ведаў фандокаўцаў. Аднак немалаважнае значэнне маюць па-хатняму ўтульная абстаноўка ў бібліятэцы, зручная мэбля, багацце кветак, вельмі паважлівыя адносіны да наведвальнікаў з боку загадчыцы бібліятэкі Людмілы Васільеўны Лапыш, бібліятэкараў Таісы Рыгораўны Календа, Наталлі Аркадзьеўны Піменавай, Алы Мікалаеўны Зайцавай, іх кампетэнтнасць, жаданне ўсямерна дапамагчы ў падборы той або іншай літаратуры.

Нельга не ўлічваць і таго, што дырэктар Дома культуры Эдуард Пятровіч Лапыш сам заўзяты кнігалюб, добра разбіраецца ў літаратуры, актыўна ўдзельнічае ў рабоце па камплектаванню фонду перыядычнай, вучэбнай, даведачнай і мастацкай літаратуры, вышуквае з бюджэту Дома культуры сродкі для выпіскі газет і часопісаў, набыцця кніг. І ў гэтым ён знаходзіць разуменне і матэрыяльную падтрымку з боку адміністрацыі акцыянернага таварыства і перш за ўсё генеральнага дырэктара Анатоля Міхайлавіча Гручанкова.

Для зручнасці чытачоў бібліятэка праводзіць "Дні інфармацыі", у час якіх наладжваюцца выставы новых кніжных паступленняў, арганізаваны пункты выдачы кніг на фабрыцы мяккай мэблі, заводзе драўнінавалакністых пліт, у санаторыі-прафілакторыі і сямейным інтэрнаце, што размешчаны на вуліцы Спартакаўскай.

Кожны з чытачоў можа знайсці штосьці для сябе. Так, многія мужчыны аддаюць перавагу мемуарнай літаратуры і дэтэктывам. Для іх багаты выбар яе, а таксама дэтэктыўнай – ад Марыніной да Сухава і Вароніна. Жанчынам да спадобы новыя серыі, такія, як "Жанчына-міф", "Маё дваццатае стагоддзе", "Чалавек-легенда", "Дас`е на зорак", "Жаночыя раманы". Для навучэнцаў і студэнтаў, а таксама тых, хто жадае пашырыць свой кругагляд, існуе разнастайная пазнавальная літаратура, напрыклад, маляўнічыя серыі "Усё аб усім", "Усё аб усіх", "Хто ёсць хто", "Я пазнаю свет".

Бібліятэка пастаянна абнаўляе фонд вучэбных дапаможнікаў. Цяпер яна валодае новымі кнігамі па эканоміцы, культуралогіі, філасофіі, псіхалогіі, статыстыцы. У дастатковай колькасці ёсць слоўнікі і даведнікі. Інтэлектуалам адрасавана серыя кніг выдатных мысліцеляў старажытнасці Платона, Плутарха і многіх іншых.

Зразумела, спецыфіка нашага часу тлумачыць той факт, што бібліятэка папаўняецца кнігамі, кніжнымі серыямі, якія карыстаюцца попытам і выклікаюць у бібліятэчнай аўдыторыі жаданне чытаць.

Бібліятэкары сталі ініцыятарамі стварэння клуба "Сустрэча", куды ўваходзяць работнікі прадпрыемства, якія выйшлі на пенсію і цяпер з`яўляюцца не толькі ветэранамі працы, але і ветэранамі чытання. Адзін раз у квартал клуб праводзіць літаратурныя вечары, кожны з якіх мае пэўную тэматыку і ў адпаведнасці з ёю праводзяцца дыскусіі, чытаюцца даклады. Часта ў гэтых вечарах прымае ўдзел фальклорны ансамбль Дома культуры, якім кіруе Г. І. Гісіч.

Работу гэтага клуба можна разглядаць, як спосаб арганізацыі адпачынку людзей пенсійнага ўзросту з мэтай зрабіць іх жыццё больш цікавым і разнастайным.

А ў пачатку верасня на базе фандокаўскай бібліятэкі плануецца правесці семінар, у якім прымуць удзел як супрацоўнікі бібліятэк нашага горада, так і мінскага цэнтра нямецкай літаратуры.

Аб узроўні работы бібліятэкі сведчыць той факт, што мінскі часопіс "Бібліятэчны свет" адзначыў яе на сваіх старонках.

Таццяна ШУШУНОВА,
студэнтка факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

ОТДЕЛЕНИЕ НРАВОВ: "ИНТИМ" НЕ ПРЕДЛАГАТЬ!

Раньше об этом не принято было говорить. Пережиток прошлого, который к нашей действительности не имеет никакого отношения, – таково было официальное мнение. Но, тем не менее, все это существовало, а в последнее время заявило о себе с новой силой.

Древнейшая из профессий, проституция, соседствует с наркоманией, а в последнее время и со СПИДом, представляя опасность не только для отдельных граждан, но и для всего общества.

*С мая 1999 года в республике создано Управление нравов и борьбы с незаконным оборотом наркотиков МВД. Наш корреспондент встретился с подполковником милиции **Андреем Ивановичем СЕМЕНОВЫМ**, который в Бобруйске руководит отделением нравов и борьбы с незаконным оборотом наркотиков.*

– Андрей Иванович, насколько вопрос о проституции актуален сегодня в республике и нашем городе?

– В последнее время в республике растет число женщин, которые привлекаются к административной ответственности за занятие проституцией. В Минске в настоящее время состоят на учете более одной тысячи проституток. В Бобруйске в прошедшем году к административной ответственности по ст. 162^1 КоАП (проституция) привлечено четверо девиц легкого поведения. Но, если учесть, что это лишь видимая, так сказать, "надводная часть айсберга", и что в Бобруйске в настоящее время зарегистрировано 44 человека, больных СПИДом, то и эта цифра вызывает тревогу.

В начале года средства массовой информации города оповестили бобруйчан о возбуждении уголовного дела за распространение ВИЧ-инфекции человеком, который знал о своей болезни, но "наградил" ею свою сожительницу, а та заразила еще нескольких человек. История, конечно, трагическая и никто не застрахован от подобного, если не принимать соответствующие меры безопасности. Одна из них – исключить половые контакты с малознакомыми или незнакомыми партнёрами, тем более с проститутками, которые сами по роду своей деятельности за 20-30 долларов, а, иногда просто за хороший ужин рискуют своим здоровьем. Таким образом, нравственность тесно связана с сохранением здоровья и самой жизни.

Кроме того, проституция тесно связана с другими проявлениями преступного мира. Красивая, легкодоступная женщина может легко вскружить голову мужчине. А если еще в спиртное красавица добавит "дурманящего зелья", клиент вообще теряет сознание. После этого неудавшиеся Дон Жуаны, лишившись своих денег, машин или другого имущества, обращаются с заявлениями в органы милиции. Причем, из примет своих ночных подружек в лучшем случае могут вспомнить только имена. А вот другой пример.

Не так давно к нам обратилась дама, которая встретила в Бобруйском ресторане приличного мужчину, прямо ну "настоящий полковник", который "охмурил" её и оставил без денег и драгоценностей. Как оказалось, мошенник, бобруйчанин, "работал с женщинами" еще и в Могилеве и Витебске и везде был верен своей привычке: оставлять себе что-нибудь " на память" о прошедшей встрече. Нередки случаи, когда амурные похождения заканчиваются банальным грабежом или кражей. Небезопасны сексуальные забавы и для самих жриц любви.

– Андрей Иванович, что вы можете сказать о существовании такого преступного бизнеса, как торговля женщинами?

– Действительно, эта проблема существует во многих республиках стран содружества и для нашей республики и города она достаточна актуальна. Среди проституток есть не только те, кто занимается этим добровольно. Часть девушек под различными предлогами принуждают заниматься проституцией. Часто это происходит на фоне наркотической зависимости.

Об истинных масштабах распространения этого вида преступлений можно только догадываться, так как многие женщины чаще всего скрывают то, что с ними произошло, и не спешат обращаться за помощью.

В начале 1999 года за сводничество был осужден житель нашего города гр. Т., который вывозил для занятия проституцией за границу, в Прибалтику, двух сестёр С., которые, как оказалось, больны СПИДом.

Благодаря открытости границ, облегчению перемещения наших граждан технология секс-бизнеса, или работорговли двадцатого века, упростилась. Возьмите любую газету, и вы найдете предложение работы в дальнем или ближнем зарубежье для девушек возраста 18-25 лет в качестве танцовщиц, манекенщиц, воспитательниц, гувернанток, нянечек и т. п. Заработок предлагается приличный, причем в валюте. Предлагаемые условия представляются просто фантастическими. Ну, кто, скажите, не хочет хорошо зарабатывать?!

Когда ничего не подозревающая кандидатка приходит на собеседование, то вдруг замечает, что наниматели, отбирая на работу, обращают внимание не столько на профессиональные качества и знание языка той страны, в которой придется работать, сколько на внешность, объём груди, рост. Кто сразу догадывается, какая "работа" предстоит им в будущем, а кто, увлечённый заманчивой перспективой заработать много денег, попадается на этот простенький трюк.

Оформление документов, получение виз, формирование групп для выезда – всё это для опытных торговцев живым товаром дело техники. И только после того, как приехавшие на место танцовщицы и гувернантки оказываются далеко от дома, без паспортов и под надёжной охраной, девушки узнают, какая работа их ждёт. Мышеловка захлопывается, и девушки вынуждены выполнять все, что потребуют от них хозяева.

– Куда чаще всего вывозят наших девушек?

– В Германию, Голландию, Турцию, Грецию, Кипр, Израиль и даже Россию.

Недавно, благодаря консульскому управлению МИДа нашей республики и управлению нравов и незаконного оборота наркотиков МВД, вернулись на родину гражданки, которые оказывали интимные услуги на американской военной базе в Южной Корее. Их вывезли туда в составе танцовщиц для работы якобы в стриптиз-баре. Посредники, граждане Беларуси, получили за каждую завербованную таким образом девушку по 2 тысячи долларов. В настоящее время эти люди привлечены к уголовной ответственности.

Но женщин продают не только за границу. В прошлом году УНОН выявлено на территории республики 17 притонов, в которых девушки как добровольно, так и в принудительном порядке оказывали интимные услуги. Большинство "точек" находилось в столице. В Бресте разоблачён притон, в котором у женщин были отобраны документы, их заставляли оказывать интимные услуги клиентам, а руководил этим "заведением" брестский авторитет по кличке "Огурец". В случае отказа прижигали тело сигаретами, били, издевались над ними.

– Чем руководствуетесь в своей работе, какова законодательная база?

– Основной статьей, которая в настоящее время регламентирует нашу борьбу со сводничеством и содержанием притонов, является ст. 221 УК РБ. С января 2001 года начинает действовать новый Уголовный кодекс, в котором появились такие статьи, как "Торговля людьми", "Похищение человека", "Незаконное лишение свободы", "Вербовка и эксплуатация людей" и другие. Так что теперь бороться в этими явлениями станет легче.

Ю. АРХИПОВ.

Для дзяцей усіх узростаў

"Ваша выстава "Этапы вялікага шляху", у якой сабрана і аформлена шмат матэрылаў па ваенна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей, падлеткаў і моладзі, мяне ўразіла. Адчуваецца, што вы любіце сваю работу, якой прысвяцілі ўсё сваё жыццё, не шкадуеце сіл і энергіі для высакароднай справы на карысць нашай Радзімы – Рэспублікі Беларусь. Жадаю Вам моцнага здароўя, маладосці і далейшых творчых пошукаў".

Такі запіс пакінула ў кнізе водгукаў педагог-арганізатар ЖЭУ-3 Г. В. Капусціна пасля наведвання выставы экспанатаў кіраўніка музея пры Бабруйскім гарадскім ваенкамаце, старшыні савета ветэранаў ЖЭУ-3, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ветэрана працы і Узброеных сіл, настаўніка моладзі Уладзіміра Фаміча Гаўрыленкі.

Яго дапаўняе водгук блакадніцы Ленінграда, педагога сярэдняй школы № 3 Г. І. Першынай, якая ахарактарызавала яго так: "Мы назіралі, як адзінаццацігадовыя хлопчыкі сціхалі, калі разглядвалі экспанаты выставы. Затым яны чыталі, дзяліліся ўражаннямі аб прачытаным".

